**2022**

**Снежань**

# Бібліятэчны веснік

ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”














**Інфармацыйны веснік**

# *Снежань*

**12**

**1 снежня** ў рамках прафілактычных мерапрыемстваў, прымеркаваных да Сусветнага дню барацьбы са СНІДам у літаратурна-музычнай гасцёўні Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла акцыя-канцэрт ”Твоё будущее в твоих руках“, на якую сабраліся навучэнцы адукацыйных устаноў горада. Падчас мерапрыемства супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі расказалі пра шляхі заражэння ВІЧ-інфекцыяй і меры яе прафілактыкі, пра тое, як ВІЧ пераходзіць у стадыю СНІД, пра меры прафілактыкі. Аб эпідэміялагічнай сітуацыі, аб тым, як можна выявіць ВІЧ, магчымасцях тэсціравання расказала галоўны ўрач ДУ ”Гарадоцкі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі" Алеся Бравая. Усіх удзельнікаў акцыі заклікалі весці здаровы, актыўны лад жыцця. У фае бібліятэкі была аформлена выстава-папярэджанне ”Осторожно: СПИД “. На выстаўцы размешчаны інфармацыйна-асветніцкія матэрыялы, якія расказваюць аб гісторыі захворвання, аб сімптомах і спосабах перадачы ВІЧ-інфекцыі, а таксама аб прафілактыцы СНІДу.






**2 снежня** для бібліятэкараў Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк прайшоў семінар бібліятэчных работнікаў ”История библиотеки в истории родного края“. Пачалося мерапрыемства ў чытальнай зале Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі з абмеркавання актуальных пытанняў: запаўненне гадавых справаздачных форм, распрацоўка краязнаўчай выдавецкай дзейнасці бібліятэк. Потым бібліятэкары наведалі музейны пакой бібліятэчнай справы ”Бібліятэка ў гісторыі“. Працягнулася мерапрыемства выездам у Віраўлянскую сельскую бібліятэку на юбілейны вечар ”Библиотека и читатель: вместе по жизни“. Бібліятэкар Якубава Ала Пятроўна сустрэла гасцей у бібліятэцы і запрасіла на святочную праграму, прысвечаную 100-годдзю з дня заснавання бібліятэкі. Са словамі віншавання выступілі: старшыня Віраўлянскага сельвыканкама Аўдзееў А.У., намеснік дырэктара ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк” Адаменка І. В., работнікі цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэкары сельскіх бібліятэк. Са святочнымі пажаданнямі звярнуліся чытачы і ўдзельнікі клубаў па інтарэсах, якія працуюць пры бібліятэцы. У завяршэнні мерапрыемства па ініцыятыве старшыні Віраўлянскага сельвыканкама Аўдзеева А.У., каля будынка бібліятэкі і сельвыканкама, быў устаноўлены валун з таблічкай, на якой выгравіраваны словы вядомага артыста тэатра ім. Я. Коласа Пятра Ламана. Бібліятэкар падзякавала прысутным за віншаванні, лепшым чытачам уручыла дыпломы і запрасіла ўсіх на святочнае чаяванне.





**2 снежня** ў літаратурна-музычнай гасцёўне пад час семінару для работнікаў клубных устаноў прайшоў агляд кніжнай выставы ”Традыцыйная культура Гарадоччыны “, на якой былі прапанаваны кніжныя выданні, у якіх адлюстраваны традыцыйныя рамёства, фальклор Гарадоччыны.

**6 снежня** для карыстальнікаў сайта Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк былі прапанаваны навіны заканадаўства ў **прававым навігатары ”Осторожно линии электропередач!“**. Кожны жадаючы меў магчымасць даведацца аб парадку ўстанаўлення ахоўных зон электрычных сетак, памерах і рэжыме іх выкарыстання, для ажыццяўлення якіх работ неабходна атрымаць згоду ўладальніка электрычнай сеткі. А таксама аб Палажэнні, якім вызначаецца парадак устанаўлення ахоўных зон электрычных сетак і шмат іншага.



**15 снежня** ў **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылося выніковае паседжанне клуба ”Неугомонные детки“. У рамках пасяджэння для ўдзельнікаў быў падрыхтаваны **брэйн-рынг па правах дзіцяці ”Дети имеют право**“. Падчас мерапрыемства бібліятэкар у даступнай форме растлумачыла дзецям, што такое права, што такое канвенцыя аб правах дзіцяці, на што мае права кожнае дзіця, якія правы і абавязкі дзіцяці ў сям'і, якія правы і абавязкі вучня ў школе. Падчас мерапрыемства хлопцы пачулі павучальную гісторыю ”Три сына“, змаглі стаць акцёрамі ў сцэнцы ”Правы ва ўсіх роўныя“, з задавальненнем паглядзелі мультфільмы ”Права детей“ і ”Смешарики. Азбука прав детей“. Напрыканцы мерапрыемства ўдзельнікі атрымалі салодкія прызы.




**20 снежня** ў ДУА ”Сярэдняя школа №2 г. Гарадка ім. А.П. Сабалеўскага“ для навучэнцаў 11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі раёна адбылося раённае прафарыентацыйнае мерапрыемства ”Ярмарка целевой подготовки“. Перад выпускнікамі школ выступілі кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый раёна, а таксама прадстаўнікі вышэйшых навучальных ўстаноў Віцебскай вобласці. Дырэктар ДУА ”Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк“ Абрамава А.В. расказала дзецям пра асаблівасці прафесіі бібліятэкара, гісторыю яе ўзнікнення, падрабязна спыніўшыся на навучальных установах, якія рыхтуюць спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы. У дадатку да выступлення ўсім навучэнцам былі раздадзены інфармацыйныя буклеты.

**21 снежня** ў межах дабрачыннай акцыі ”Нашы дзеці“, супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай** бібліятэкі наведалі ДУА ”Сацыяльна-педагагічны цэнтр Гарадоцкага раёна“. Там іх з радасцю сустрэлі юныя выхаванцы цэнтра і Дома сямейнага тыпу для якіх была праведзена навагодняя мазаіка-віншаванне ”Подарите сказку детям“. Спачатку дзеці паглядзелі лялечныя спектаклі ”Кот и лиса“. і ”Новогодние приключения Колобка“. Сапраўдным навагоднім цудам стала для прысутных з’яўленне Снягуркі. Разам з казачнымі героямі яна загадвала дзецям загадкі, а за кожны правільны адказ іх чакалі салодкія прызы. Напрыканцы мерапрыемства бібліятэкары падарылі маленькім гасцям дзіцячыя маляўнічыя часопісы і новыя цікавыя кнігі.



**21 снежня** супрацоўнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прынялі ўдзел у гарацкім святе зажжэння навагодніх **агней ”Ёлочка зажгись!“** Бібліятэкары пераапрануліся ў Дзеда Мароза, Снягурку і розных казачных герояў і прадставілі на сцэне музычнае прывітанне, пад якое на цэнтральнай плошчы весела танцавалі ўсе прысутныя.

**22 снежня** у рамках праекта ”Чытаем разам па-беларуску!“ у **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшла **фальклорная талака ”Ад зерня да каравая “**, на якую былі запрошаны выхаванцы дзіцячых садкоў горада. Падчас мерапрыемства дзеці даведаліся аб гісторыі з’яўлення хлеба на стале, як няпроста вырошчваць хлеб, які доўгі шлях ён праходзіць ад зярнятка да духмянай булкі. Таксама дзеці даведаліся пра нялёгкую працу земляроба і камбайнера, вадзіцеля, мукамола і пекара, якія даюць нам магчымасць жыць і бачыць кожны дзень на сваім стале смачны хлеб. Бібліятэкар заклікала дзяцей абыходзіцца з хлебам беражліва, шанаваць яго. У рамках гадзіны гучалі вершы пра хлеб, прыказкі і прымаўкі. Дзеці прынялі ўдзел у конкурсах і гульнях: ”Бліны і коцік “,”Каласок“, ”Хлебныя загадкі“, ”Пытанне – адказ“, ”Збяры каравай“, ”Назаві ласкава“ і інш. А напрыканцы мерапрыемства маленькія ўдзельнікі з задавальнннем пачаставаліся баранкамі.



**23 снежня** да 79-гадавіны вызвалення Гарадоцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у літаратурна-музычнай гасцёўні **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для жыхароў горада прайшоў **гістарычны экскурс ”Гісторыі подых жывы“**, пад час якога бібліяттэкар расказала прысутным аб Гарадоцкай наступальнай аперацыі, затым быў паказаны фільм прысвечаный маршалу Савецкага Саюза, камандуючага вайскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту, вызваляўшага Гарадоцкі раён. Удзельнікі мерапрыемства з цікавасцю прынялі ўдзел у віктарыне ”Вызваленне Гарадоцкага раёна“ і азнаёміліся з кніжнай выставай ”Пусть будет с вами память “. Таксама да гэтай значнай падзеі ў афіцыйных сацыяльных сетках Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі праводзіўся **патрыятычны інтэрнэт-чэлендж ”Я читаю книгу о войне“.** Усім жадаючым было прапанавана сфатаграфавацца са сваёй любіма кнігай пра вайну і апублікаваць фатаграфію на сваю старонку ў любых соцсетках.

**27 снежня** бібліятэкар адзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі прапанавала сваім юным чытачам наведаць **казачную гадзіну ”Казкі маёй бабулі!“, якая адбылася ў рамках праграмы ”Чытаем разам па беларускі“.** Мерапрыемства прайшло весела і пазнавальна. Велізарнае задавальненне дзеткі атрымалі ад конкурсаў: ”Адгадай казачнага героя“,гульняў ”Мышка“, ”Назаві казку“, ”Пераўтварыся ў казачнага героя “. Затым удзельнікі апынуліся на паляне казачных загадак, адгадвалі герояў народных казак, казачных жывёл, угадвалі казкі па малюнку.

Таксама **27 снежня бібліятэкар адзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падрыхтавала для маленькіх карыстальнікаў **ток-шоу ”Школа ветлівых навук“**. Падчас мерапрыемства дзеці разважалі, што азначаюць паняцці ”ветлівасць“, ”дабрыня“, навошта людзі выкарыстоўваюць ветлівыя словы. Адкуль з'явіліся гэтыя словы. Якія ветлівыя словы трэба ўжываць у пэўных сітуацыях. З цікавасцю дзеці ўключыліся ў гульні ”Ветліва-няветліва“ і ”Сяброўскі поціск рукі“. Таксама разгадвалі загадкі, абмяркоўвалі верш ”Урок ветлівасці“. У канцы ўсе з задавальненнем паўдзельнічалі ў інсцэніроўцы двух спектакляў ”Рэпка“ і ”Казка пра прынцэсу“.



**28 снежня** бібліятэкар **адзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** запрасіла сваіх юных наведвальнікаў на **навагоднюю забаўляльную праграму ”Новы год да нас прыйшоў!“**. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй самага чароўнага свята, разнастайнасцю навагодніх традыцый і звычаяў розных краін, прынялі ўдзел у вясёлым навагоднім конкурсе ”Без чаго не бываць Новаму году? “, дружна гулялі ў гульні: ”Ёлачныя ўпрыгожванні“,”Навагодні маскарад “,”Дзве лепш, чым адна “,”Навагоднія фанты “,”Забяры падарунак “. Адказвалі на пытанні з ”Навагодняй шкатулкі“. Мерапрыемства прайшло весела, яскрава і цікава.

**29 снежня ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** школьнікаў чакала **казачная імпрэза лялечнага тэатра ”Калабок“**. Дзіўныя прыгоды персанажаў **лялечных спектакляў ”Навагоднія прыгоды Калабка“ і ”Кот і ліса“** не пакінулі юных гледачоў абыякавымі. Дзеці перажывалі за маленькага Калабка, які адправіўся ў небяспечнае падарожжа, каб хутчэй даставіць да Новага года ўнучцы Дашы тэлеграму ад бабулі і дзядулі, смяяліся з хітрага лянівага ката, які напалохаў усіх лясных жыхароў і здабыў новы дом. Прысутныя атрымалі шмат станоўчых эмоцый і добры настрой на цэлы дзень.

**30 снежня ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падчас **літаратурнага падарожжа ”Па лясной сцежцы “** дзеці здзейснілі віртуальнае падарожжа ў дзіўны свет прыроды, даведаліся, якую ролю адыгрывае чалавек у ахове прыроды. Яны актыўна гутарылі, адказвалі на пытанні, адгадвалі лясныя загадкі, з задавальненнем удзельнічалі ў вясёлых конкурсах і гульнях**, ”Даведацца пра звера, птушку па малюнку“, ”Падбяры пару“, ”Жук-жучышча“.** З цікавасцю паслухалі, а пасля актыўна абмеркавалі, апавяданні **”Паездка ў лес“** і **”Казка пра лес“.**



**31 студзеня ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылася **гульня-падарожжа ”Пад шапкай-невідзімкай“.** Яна праводзіліся з мэтай знаёмства з кнігамі пісьменнікаў-анімалістаў: Біянкі, Жыткова, Прышвіна, Скрабіцкага, Сладкова, Чарушына. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з **кніжнай выставай ”Праз кнігу ў свет прыроды“**, расказала як пісьменнікі размаўляюць з героямі сваіх апавяданняў. А пасля ўсе з вялікім задавальненнем сталі ўдзельнікамі вясёлых конкурсаў ”Хто я такі“, ”Чапушынкі з лесу“, ”Бег жаб“, ”Конікі“, ”Лясныя даганялкі“, ”Бюро надвор’я“.

